## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

***Навошта марнаваць грошы на дарагія садовыя інструменты і іншы інвентар, калі масу карысных рэчаў можна зрабіць з таго, што і так ужо ёсць дома. Вось некалькі прыкладаў, як прымяняць з карысцю тое, што вы звычайна выкідваеце.***

# НЕ МАРНУЙЦЕ ГРОШЫ НА ДАРАГІЯ САДОВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

### Пластыкавыя бутэлькі замест распыляльнікаў



Каб паліць газон і градкі, прарабіце ў бутэльцы адтуліны і прыкруціце да шланга з дапамогай скотча. Толькі мацней! Акрамя палітага газона, ад такой «палівалкі» будуць у захапленні дзеці.

### Палівачка са старой каністры



Бяром самую тоўстую іголку, награваем на агні, робім адтуліны ў вечку...

Наліваем ваду ў каністру, накручваем вечка на месца. Страцілі рассякальнік ад садовай палівачкі? Нічога, зараз у вас ёсць новая.

### Кантэйнеры для расады з яек



Шкарлупіна з-пад яек — ідэальны посуд прарошчваць насенне для расады. Пасля таго як расліны падрастуць, іх можна саджаць у зямлю разам з кантэйнерам. Ён будзе служыць яшчэ і ўгнаеннем.

### Садовы маркер з разбітых талерак

Разбіўся кубак або талерка — на шчасце! Выкарыстоўвайце яе замест садовых маркераў, падпісаўшы назвы расліны. Марнаваць грошы на іх набыццё зусім не трэба. Выдатныя таблічкі атрымліваюцца і з пластыкавых нажоў, і са звычайных галінак. Палачкі ад марожанага таксама падыдуць.

### Яшчэ адзін кантэйнер



Утулкі з-пад туалетнай паперы — яшчэ адзін варыянт выдатнага кантэйнера. Зрабіце чатыры падоўжаныя надрэзы з аднаго боку ўтулкі і складзіце, як скрыначку.

### Адпужвальнік з відэльцаў



Каб цікаўныя каты і іншыя хатнія ўлюбёнцы не таптаді вашы градкі, уторкніце каля кожнай расліны пластыкавыя відэльцы. Надзейная абарона!

### Цэгла замест кашпо



Полыя (пустацелыя) сценавыя блокі выдатна падыходзяць на ролю бардзюраў і міні-кветнікаў для раслін. Спатрэбяцца яны не толькі ў садзе, але і на балконе ў горадзе.

### Кармушкі для птушак з бутэлек



Робім у бутэльцы чатыры адтуліны так, каб адна аказалася вышэй за другую (пад вуглом 45 градусаў), устаўляем старыя лапаткі для памешвання, насыпаем корм альбо семачкі. Кармушка гатовая.

### Адпужвальнік для птушак



Не ведаеце, як абараніць ураджай клубніц ад сарок ці іншых птушак? Паспрабуйце такі просты спосаб. Размалюйце дробныя каменьчыкі фарбамі так, каб яны сталі падобныя на ягады, і раскладзіце пад кусты за пару тыдняў да таго, як паспее ўраджай. Птушкі паспрабуюць іх дзяўбці, зразумееюць, што яны неядомыя, а да таго часу, калі паспеюць сапраўдныя ягады, перастануць звяртаць увагу на нешта чырвоненькае сярод кустоў. Такі спосаб працуе з памідорамі таксама! Толькі для іх трэба выкарыстоўваць старыя ёлачныя шары чырвонага колеру.

### Міні-парнік



З абрэзанай пластыкавай бутэлькі (пагадзіцеся, яна ўвогуле ў садзе незаменная).

### Бясплатнае ўгнаенне



Замест таго, каб купляць хімікаты, выкарыстоўвайце ваду, у якой варылася гародніна. Не злівайце яе ў ракавіну, а смела падкормлівайце расліны ў агародзе. У гэтай вадзе шмат усяго карыснага, што вельмі падабаецца раслінам. Вядома, ваду трэба перш астудзіць да пакаёвай тэмпературы.

### Стары абрус замест тачкі

Трэба хутка перацягнуць што-небудзь цяжкае з аднаго кута саду ў другі? Знойдзены выдатны спосаб.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.26 | 16.49 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.31 | 7.07 |
| Магілёў — | 9.17 | 16.39 | 7.22 |
| Гомель — | 9.04 | 16.44 | 7.40 |
| Гродна — | 9.40 | 17.06 | 7.26 |
| Брэст — | 9.32 | 17.15 | 7.43 |

## Месяц

*Апошняя квадра 21.12—28.12.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

**Пр.** *Анфісы, Кірыла, Патапа.*
**К.** *Пятра, Тамаша, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА





## «Звязда» сто гадоў з вамі!




Традыцыі нараджаюцца проста: варта штосьці зрабіць адзін раз, зразумець, што гэта — добра, гэта — тое, што трэба! І потым паўтарыць — і раз, і два, і тры...

У традыцыях «Звязды» ліставанне і сустрэчы з чытачамі, розыгрыш прызоў, сумесныя праекты і святы, узаемныя віншаванні ды падарункі... У прыватнасці, разам з першымі нумарамі ў новым годзе да нашых падпісчыкаў — абсалютна бясплатна — прыйдуць адмысловыя календары: стыльны насценны, так неабходны ўсім садаводам-агароднікам месяцавы, канфесійных свят, народны...

***Выпісвайце «Звязду»!***
***Падтрымлівайце нашу мову!***


## Даты Падзеі Людзі

### 21 СНЕЖНЯ

**1773** год — нарадзіўся Роберт Броўн, брытанскі батанік, у гонар якога названы броўнаўскі рух. У 1820 годзе вучоны становіцца захавальнікам батанічнага аддзялення Брытанскага музея, а ў 1849-м — прэзідэнтам таварыства Карла Лінея ў Лондане.

**1796** год — 220 гадоў таму нарадзіўся (в. Мясата, цяпер у Маладзечанскім раёне) Зан Тамаш, паэт-рамантык, удзельнік вызваленчага руху. У 1820 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў віленскіх таемных таварыстваў і студэнцкай моладзі. У 1823-м арыштаваны і высланы ў Арэнбург, дзе стварыў мінералагічны музей. З 1841 года жыў у Беларусі. Вывучаў беларускі фальклор. Аўтар паэм «Котка», «Мёд», балад «Твардоўскі», «Свіцязь-возера» і іншых. Сябраваў з А. Міцкевічам, аказваў уплыў на яго творчасць. Памёр у 1855 годзе.

**1890** год — дата нараджэння Мікалая Ільіча Аладава, кампазітара, педагога, народнага артыста Беларусі. Адзін з арганізатараў і першых выкладчыкаў Беларускай кансерваторыі і Беларускага музычнага тэхнікума. У 1944—1948 гадах — дырэктар Белдзяржкансерваторыі. У 1932 годзе ўдзельнічаў у стварэнні Беларускага саюза кампазітараў. Заклаў асновы жанраў беларускай прафесійнай музыкі, стварыў першыя ў беларускай музыцы прыклады драматычных і лірыка-псіхалагічных сімфоній. Аўтар больш за 260 музычных твораў розных жанраў, збіральнік і даследчык беларускага, марыйскага, чувашскага, якуцкага фальклору, аўтар апрацовак народных песень. Памёр у 1972 годзе.

**1896** год — нарадзіўся Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі, савецкі ваенны дзеяч і палкаводзец, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны імя К. Ракасоўскага засталося не толькі дзякуючы таму, што ён бліскуча правёў мноства наступальных аперацый, але і таму, што 24 чэрвеня 1945 г. ён камандаваў парадам Перамогі ў Маскве. Камандаваў механізаваным корпусам, арміяй на Заходнім фронце, войскамі Бранскага, Данскога, Цэнтральнага, 1-га і 2-га Беларускіх франтоў. Кавалер найвышэйшага ваеннага ордэна СССР — ордэна «Перамога».



### Было сказана

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт, драматург, перакладчык:**
*«Кожная сцежка шукае дарогу».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Працяглыя адносіны — гэта калі першая фраза пасля сакса будзе:**
**— Вой, я ж боршч забылася ў халадзільнік паставіць...**

Чацвёртае відовішча, на якое можна глядзець бясконца — як малады, амбіцыйны і мэтанакіраваны мужык на летняй гуме спрабуе выбрацца з гурбы.

**Расшыфраваны апошні запіс пасадачнага модуля «Скіяпарэлі», які накіравалі на Марс:**
**— Чорт мяне вазьмі, марсіяне! Ды якія злыя...**

Запіс у штодзённіку дзяўчыны:
1. Істэрыка мужу.
2. Прайсціся па крамах.

**На экзамене.**
**— Які білет ведаеш?**
**— Білет Дзяржаўнага банка.**
**— Давай сюды, малайчына. Здаў.**

Жонка папрасіла перадаць ёй цюбік з памадай, а я перабблытаў і даў цюбік з суперклеем.

Яна да гэтага часу са мной не размаўляе.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Першы намеснік дырэктара — галоўнага рэдактара Алена Леанідаўна ЛЯЎКОВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 5007.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12